View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТАДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Электронны зборнік навуковых артыкулаў
IV міжнароднай навуковай канферэнцыі
да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта

(Полацк, 19–20 красавіка 2018 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А. І. Корсак

Наваполацк
ПДУ
2018

PolotskSU

УДК 94(476)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

Рэдакцыйная калегія: д-р гіст. навук, праф. Д. У. ДУК;
канд. гіст. навук, дац. В. В. ДАНІЛОВІЧ;
чл.-кар. НАН Беларусі, д-р гіст. навук, праф. М. Ф. ПІЛІПЕНКА;
канд. гіст. навук, дац. А. І. КОРСАК (адк. за вып.);
канд. гіст. навук, дац. В. А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК;
канд. гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ

Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў [Электронны рэсурс] : электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

ISBN 978-985-531-617-7.

*Выдаецца з 2018 года (у друкаваным выглядзе – з 2004 г.)*

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы IV міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў». Прадстаўлены вынікі археалагічных, антрапалагічных і этнаграфічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, мовазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

Зборнік уключаны ў Дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 3031816593 ад 08.10.2018.

Дызайн вокладкі *У. А. Крупеніна*
Тэхнічнае рэдагаванне *Т. А. Дар'янавай, В. П. Міхайлавай*
Камп'ютарная вёрстка *Д. М. Севасцьянавай*

211440, вул. Блахіна, 29, г. Наваполацк, Беларусь
тэл. 8 (0214) 39 40 46, e-mail: a.korsak@psu.by

ISBN 978-985-531-617-7 © Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2018

PolotskSU



УДК 94 (476)

# СКАСАВАННЕ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ
# І ФАРМІРАВАННЕ ВІЦЕБСКАЙ, АРШАНСКАЙ І ПОЛАЦКАЙ АКРУГ У СКЛАДЗЕ БССР

*А.В. БАРАНОЎСКІ*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск

*На аснове архіўных матэрыялаў разглядаецца працэс скасаванне Віцебскай губерні і фарміраванне Віцебскай, Аршанскай і Полацкай акруг у складзе БССР.*

У 1923 г. у Віцебскай губерні як і па ўсёй РСФСР прайшло ўнутрыгубернскае раянаванне, у выніку якога былі значна узбуйнены паветы і воласці. У БССР гэта яшчэ планавалася зрабіць, тут па-ранейшаму адміністрацыйныя адзінкі практычна існавалі ў дарэвалюцыйным выглядзе. Пасля таго, як стала зразумела, што у хуткім часе адбудзецца ўзбуйненне БССР, была створана спецыяльная камісія па раянаванню Беларускай рэспублікі на чале са старшынёй СНК І.А. Адамовічам. Камісія займалася фарміраваннем новай сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення БССР. У выніку яна падтрымала варыянт аб утварэнні на тэрыторыі узбуйненай Беларусі 8 акруг. На аснове ліквідуемай Віцебскай губерні было вырашана стварыць Аршанскую, Віцебскую і Полацкую акругі [1, с. 72–73].

Пытаннямі, звязанымі са скасаваннем Віцебскай губерні і ліквідацыяй губернскіх органаў, займаліся арганізацыйная, адміністрацыйная і бюджэтная камісіі, якія былі вылучаны прэзідыумам Віцебкага губвыканкама. У задачы арганізацыйнай камісіі ўваходзіла вызначэнне структуры і штатаў акруговых выканкамаў, а такама Віцебскага павятова-гарадскога выканкама, таму што былы Віцебскі павятовы выканкам размяшчаўся ў губернскім цэнтры і сваіх установаў не меў, а ўсе галіны гарадскога будаўніцтва абслугоўваліся непасрэдна губернскімі аддзеламі. У гэтай сувязі было неабходна рэарганізаваць губернскія органы і наладзіць унутраную працу створанага павятова-гарадскога апарата. Распрацоўкай праекта па раянаванню Віцебскай губерні і яе падзелу на акругі займалася адміністрацыйнай камісія. Пасля абмеркаванняў камісія вырашыла тэрыторыю Віцебскай губерні падзяліць на тры акругі: Віцебскую, Аршанскую і Полацкую [2, с. 345 ].

Да Полацкай акругі было прапанавана далучыць увесь Дрысенскі і Полацкі паветы ў межах, якія існавалі да 1 студзеня 1920 г., пяць валасцей Лепельскага павета, эканамічна звязаных з Полацкам. Такім чынам, Полацкая акруга павінна была складацца з:

І. Полацкага павета з валасцямі: Аляксандраўскай, Андрэеўскай, Арцейкаўскай, Арэхаўскай, Банонскай, Вазнясенскай, Варонецкай, Ветрынскай, Гомельскай, Дамінікаўскай, Еўфрасіннеўскай, Замашанскай, Клясціцкай, Мікалаеўскай, Нацкай, Петрапаўлаўскай, Тураўлянскай, Уладзімірскай, Юравіцкай.

ІІ. Дрысенскага павета з валасцямі: Асвейскай, Дзернавіцкай, Замашанскай, Зябкаўскай, Ігналінскай, Каменскай, Каханавіцкай, Сар'янскай, Стрыжанскай, Сушкоўскай, Таболкаўскай, Філіпаўскай, Юстыянаўскай, Юхавіцкай.

ІІІ. Паўночна-Заходняй часткі Лепельскага павета з валасцямі: Бабініцкай, Гутаўскай, Кубліцкай, Ушацкай, Чарсвяцкай.

У склад Віцебскай акругі уваходзяць цалкам Гарадоцкі і Віцебскі паветы ў межах на 1 студзеня 1920 г., увесь былы Суражскі павет з трыма воласцямі, частка Сенненскага

PolotskSU



і Лепельскага паветаў, эканамічна звязаных з Віцебскам. Такім чынам, Віцебская акруга павінна складацца з:

I. Віцебскага павета з валасцямі: Астровенскай, Бабініцкай, Веляшковіцкай, Вымнянскай, Вярхоўскай, Высочанскай, Дабромысленскай, Жарэбыцкай, Каралёўскай, Курынскай, Лескавіцкай, Лёзненскай, Лаўжанскай, Лосвідскай, Міхайлаўшчынскай, Мішкаўскай, Серакаратнянскай, Старасельскай, Сялюцкай, Храпавіцкай, Шчэрбінскай, Янавіцкай.

II. Гарадоцкага павета з валасцямі: Болецкай, Бяскатаўскай, Вайханскай, Віраўлянскай, Вышадскай, Горкаўскай, Дубакрайскай, Зайкаўскай, Козянскай, Мішневіцкай, Обальскай, Паташынскай, Руднянскай, Селішчанскай, Стайкаўскай, Старынскай, Уладзімірскай, Халамерскай, Цёсцінскай.

III. Суражскага павета з валасцямі: Казакоўскай, Костлянскай, Кашэвіцкай.

IV. Сенненскага павета з валасцямі: Латыгаўскай, Машканскай, Пустынскай, Ульянавіцкай.

V. Лепельскага павета з валасцямі: Бачэйкаўскай, Бельскай, Бешанковіцкай, Варонецкай, Гарадчэвіцкай, Забалоцкай, Каменскай, Копцавіцкай, Марцінаўскай, Несінскай, Пышнянскай, Смалянецкай, Станіслаўскай, Стрыжаўскай, Цяпінскай, Ульскай, Усайскай, Франопальскай.

У сувязі з тым, што камісіі былі невядомыя межы Горацкага і Мсціслаўскага павета Смаленскай губерні, таму прыйшлося абмяжоўвацца толькі вылучэннем у Аршанскую акругу наступных валасцей Аршанскага і Сенненскага паветаў.

I. Аршанскага павета: Бараньскай, Высоцкай, Зарэчнаталачынскай, Коханаўскай, Машкоўскай, Новатухінскай, Пугляеўскай, Смальянскай, Старасельскай, Стараталачынскай.

II. Сенненскага павета: Абчужскай, Бобрскай, Высокагарадзецкай, Замоцкай, Какоўчынскай, Лісічынскай, Лукомльскай, Раснянскай, Чарэйскай [3, арк. 41–14 аб].

8 сакавіка 1924 г. адбылося апошняе пасяджэнне пленума Віцебскага губвыканкама, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх павятовых выканкамаў і загадчыкі ўсіх губернскіх адзелаў. На пленуме разглядаліся наступныя пытанні па дакладах камісій: 1) адміністрацыйнай камісіі аб адміністрацыйным раянаванні акруг, 2) арганізацыйнай камісіі аб структуры і штатах акруг, 3) бюджэтнай камісіі аб размеркаванні сродкаў па губернскаму бюджэту ў сувязі з далучэннем часткі губерні да БССР і Пскоўскай губерні РСФСР.

Пасяджэнне пленума пачалося з даклада сакратара Віцебскага губвыканкама Каралёва, аб выніках работы адміністрацыйнай камісіі. Каралёў адзначыў, што дадзенай камісіяй былі вызначаны межы Невельскага і Себежскага паветаў, якія перадаюца ў склад Пскоўскай губерні РСФСР. З астатніх паветаў Віцебскай губерні ствараюцца тры акругі:

Полацкая, у склад якой уваходзіць увесь Дрысенскі і Полацкі паветы ў межах, якія існавалі да 1 студзеня 1920 г., акрамя таго пяць валасцей Лепельскага павета, эканамічна звязаных з Полацкам.

Віцебская, у склад якой уваходзіць цалкам Гарадоцкі і Віцебскі паветы ў межах на 1 студзеня 1920 года, увесь былы Суражскі павет з трыма валасцямі, частка Сенненскага і Лепельскага паветаў, эканамічна звязаных з Віцебскам.

Аршанская, у сувязі з тым, што камісіі былі невядомыя межы Горэцкага і Мсціслаўскага паветаў Смаленскай губерні, таму было вырашана абмяжоўвацца толькі

PolotskSU


вылучэннем у Аршанскую акругу дзесяці валасцей Аршанскага павета і дзевяці валасцей былога Сенненскага павета.

Што тычыцца ўнутранага раянавання, то адзнаалася, што да новага бюджэтнага года паветы застаюцца ў сваіх ранейшых межах. Новае адміністрацыйнае дзяленне ўводзілася з 1 кастрычніка, а да гэтага часу павінны былі захоўвацца павятовыя апараты з іх павятовымі бюджэтамі [4, с. 4].

Пасля выступу Каралёва пачалося ажыўленае абмеркаванне яго дакладу. Старшыня Бачэйкаўскага павятовага выканкама Гейнэ, адзначыўшы, што дадзены праект стварэння трох акруг быў складзены "без належнай падрыхтоўкі і таму мае шмат недахопаў". Так, напрыклад, Бельская, Забалоцкая, Каменская, Марцінаўская, Несінская воласці Бачэйкаўскага павета імкнуцца да Полацка, але па праекце далучаны да Віцебскай акругі. Старшыня Полацкага павятовага выканкама Праферансаў звярнуў увагу на тое, што "акругі складзены няправільна, Віцебская ўзбуйнена за кошт Полацкай, таму праект неабходна перарабіць і Полацкую акругу арганізаваць згодна складзенаму Полацкім ПВК праекце". Акрамя таго, Праферансаў указваў на неабходнасць неадкладнай ліквідацыі паветаў і стварэння акруг так як не бачыць у гэтым ніякіх перашкод. Старшыня губсаюза кааператываў Консан адзначыў, што "работа адміністрацыйнай камісіі працякала ў ненармальных умовах: ёй было прапанавана на працягу 2-3 дзён скласці дадзены праект, і таму ён мае недахопы". Консан прапанаваў да праекту адміністрацыйнай камісіі прыкласці матэрыялы Полацкага і Бачэйкаўскага ПВК і ўсё гэта перадаць у ЦВК БССР для канчатковай распрацоўкі. На падставе ўсяго вышэй выкладзенага было вырашана праект арганізацыі акруг зацвердзіць. Прапанаваць адміністрацыйнай камісіі ўнесці ў праект некаторыя змены, маючы на ўвазе прадстаўленыя Полацкім і Бачэйкаўскім ПВК матэр'ялы [2, с. 339–340].

З наступным дакладам аб праекце стварэння акруговага выканаўчага камітэта ад імя арганізацыйнай камісіі выступіў старшыня губвыканкама Прышчэпаў. Для вызначэння правоў, абавязкаў і арганізацыйнай структуры акруговага выканаўчага камітэта і яго аддзелаў камісія ўзяла за аснову праект палажэння "Аб акруговых выканкамах Уральскай вобласці", зацверджанае УЦВК ў 1923 г. Акруговы выканкам абіраецца ў складзе не больш за 15 членаў і 5 кандыдатаў. Са свайго асяроддзя ён абірае прэзідыум у складзе 5 чалавек. Пры Акруговым выканкаме ўтвараюцца аддзелы: агульны, фінансавы, зямельны, ваенны, мясцовай гаспадаркі, адміністрацыйны, аддзел працы. Акрамя таго пры акруговым выканкаме ствараюцца: Орган дзяржаўнай палітуправы, суд, пракуратура, агенства дзяржаўнага страхавання, статыстычнае бюро і упраўленне акруговага інжынера. Прышчэпаў таксама распавёў аб арганізацыйнай пабудове акруговага выканкама, яго аддзелаў і штатаў.

Пасля непрацяглых абмеркаванняў па дадзеным дакладу было прапанавана праект арганізацыйнай структуры акруговага выканаўчага камітэта зацвердзіць і паслаць яго на канчатковае зацвярджэнне ў ЦВК БССР. Таксама было вырашана з 10 сакавіка 1924 г. лічыць Віцебскі губвыканкам спыніўшым сваё дзеянне, а фармальна перадачу спраў і канчатковую ліквідацыю губвыканкама зрабіць не пазней за 20 сакавіка. Кіраванне горадам і ўсёй тэрыторыяй Віцебскай губерні перадаць павятова-гарадскому выканаўчаму камітэту, які дзейнічае на правах акруговага выканаўчага камітэта. Для ліквідацыі губернскіх ўстаноў і паветаў, якія адыходзяць да Беларускай Рэспублікі, стварыць ліквідацыйную камісію, якая павінна скончыць сваю працу да 1 красавіка 1924 г. [4, с. 4].

PolotskSU



Дакладчыкам ад бюджэтнай камісіі быў вызначаны загадчык павятова-гарадскога фінансавага аддзелу Барадаўскі. У сваім выступе ён звярнуў увагу на парадак размеркавання сродкаў па губернскаму бюджэту ў сувязі з адыходам часткі губерні да БССР. Веліжскі, Невелскі і Себежскі паветы павіны былі будуць прафінансаваны з губернскага бюджэту цалкам па 1 красавіка, Барадаўскі таксама адзначыў, што дадзеныя паветы пакрыўджанымі не будуць, бо ім яшчэ належыць даволі буйная сума па лясных даходах і баяцца фінансавага крызісу паветам ня варта. Бюджэты чатырох паветаў, якія адыходзяць да Беларусі, было вырашана пакінуць да выканання ў ранейшым выглядзе, далучыўшы да іх у працэнтных суадносінах воласці Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў, што адыходзяць да БССР. Бюджэты Віцебскай акругі і горада Віцебска перадаваліся да выканання павятова-гарадскому выканкаму. Заканчэнне ўсіх разлікаў і ліквідацыю запазычанасці прадставіць ліквідацыйнай камісіі з тым, каб яны былі скончаны да 1 красавіка 1924 г. [2, с. 339–340].

Віцебская губернія як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка перастала існаваць 10 сакавіка 1924 г. Дзяленне на воласці і паветы захоўвалася да 17 ліпеня 1924 г., калі на Другой сесіі ЦВК БССР 6-га склікання было прынята новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне на акругі, раёны, сельсаветы. На тэрыторыі былой Віцебскай губерні былі ўтвораны:

Аршанская акруга. Яна складалася з былых паветаў: Аршанскага (без паўночна-ўсходняй трацiны), Горацкага (без паўднёва-заходняга кута), паўночна-усходняй часткі Магілёўскага (каля ¼ часткі), паўднёва-ўсходняга вугла Сенненскага, паўночнага кута Чавускага і паўночна-заходняй ўскраіны Мсціслаўскага. Аршанская акруга займала плошчу ў 6713 кв. вёрст; насельніцтва Агульная колькасць насельніцтва – 371300 чалавек, шчыльнасць насельніцтва на 1 кв. вярсту 55,5 чалавек. Цэнтрам акругі з’яўляўся г. Орша. Тут было 339 гандлёвых прадпрыемстваў. Аршанская акруга падзялялася на 10 раёнаў: Аршанскі (цэнтр г. Орша), Багушэўскі (цэнтр ч.с. Багушэўская), Горацкі (цэнтр г. Горкі), Дрыбінскі, (цэнтр м. Дрыбін), Дубровенскі (цэнтр м. Дуброўна), Копыскі (цэнтр г. Копысь), Коханаўскі (цэнтр м. Коханава), Круглянскі (цэнтр м. Круглае), Ляднянскі (цэнтр м. Ляды), Талачынскі (цэнтр м. Талачын) [5, арк. 34–35].

Віцебская акруга. Яна складаецца з Віцебскага, Гарадоцкага (без паўночна-заходняга кута), частак Сенненскага (паўночна-ўсходняя палова), Аршанскага (паўночна-ўсходняя трацiна), Лепельскага (усходняя чвэрць), Полацкага (паўднёва-ўсходні кут) [6, арк. 1–2]. Віцебская акруга займала плошчу ў 9956 кв. вёрст. Агульная колькасць насельніцтва – 582345 чалавек, шчыльнасць насельніцтва на 1 кв. вярсту 55,5 чалавек. Цэнтрам акругі з’яўляўся г. Віцебск. Тут было 1519 гандлёвых прадпрыемстваў [7, арк. 41]. Віцебская акруга падзялялася на 12 раёнаў: Бешанковіцкі (цэнтр м. Бешанковічы), Высачанскі (цэнтр с. Высокае), Гарадоцкі (цэнтр г. Гарадок), Езярышчанскі (цэнтр ч.с. Езярышча), Паўночна-Віцебскі (цэнтр с. Заронава), Лёзненскі (цэнтр м. Лёзна), Рамнёўскі (цэнтр с. Рамні), Сенненскі (цэнтр г. Сянно), Сіроцінскі (цэнтр м. Сіроціна), Суражскі (цэнтр г. Сураж), Чашніцкі (цэнтр м. Чашнікі), Паўднёва-Віцебскі (цэнтр г. Віцебск) [5, арк. 32–34].

Полацкая акруга. Яна складалася з былых паветаў: Полацкага (без паўднёва-усходняга кута), Дрысенскага, часткі Лепельскага (без усходняй чвэрці), паўночнага кута Барысаўскага. Полацкая акруга займала плошчу ў 9714 кв. вёрст. Агульная колькасць насельніцтва – 344400 чалавек, шчыльнасць насельніцтва на 1 кв. вярсту 35,5 чалавек. Цэнтрам

PolotskSU



акругі з'яўляўся г. Полацк. Тут было 172 гандлёвых прадпрыемства. Полацкая акруга падзялялася на 9 раёнаў: Асвейскі (цэнтр м. Асвея), Ветрынскі (цэнтр м. Ветрына), Валынецкі (цэнтр м. Валынцы), Дрэтунскі (цэнтр ч.с. Дрэтунь), Дрысенскі (цэнтр г. Дрыса), Полацкі (цэнтр г. Полацк), Расонскі (цэнтр ч.с. Расоны), Ульскі (цэнтр м. Ула), Ушацкі (цэнтр м. Ушачы) [5, арк. 31–32].

Такім чынам, у 1924 г. большая частка Віцебскай губерніі была далучана да БССР. Пасля ліквідацыіі губерні на яе аснове ўзнікла Аршанская, Віцебская і Полацкая акругі, якія праіснавалі да 1930 г.

ЛІТАРАТУРА

1. Елизаров, С.А. Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919-1991 гг.) / С.А. Елизаров. – Гомель : ГГТУ им. П.О. Сухого, 2009. – 222 с.
2. Витебская губерния 1917–1924 гг. : док. и материалы / сост.: Н.В. Воронова [и др.] ; ред. кол.: В.И. Адамушко [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2012. – 408 с.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 71. Воп. 1. Спр. 179.
4. Известия Витебского губисполкома и Губкома Р.К.П.(б). – 1924. – 11 марта. – С. 4.
5. ДАВВ. – Ф. 10051-п. Воп. 1. Спр. 59.
6. ДАВВ. – Ф. 71. Воп. 1. Спр. 17.
7. ДАВВ. – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 397.

## THE ABOLITION OF THE VITEBSK PROVINCE AND THE FORMATION OF THE VITEBSK, ORSHA AND POLOTSK OKRUGS IN THE BSSR

*A. BARANOVSKY*

*The article on the basis of archival materials examines the process of liquidation of the Vitebsk province and the formation of the Vitebsk, Orsha and Polotsk cantons in the BSSR.*